РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**УВЯДЗЕ́ННЕ Ў ХРАМ БО́ЖАЙ МА́ЦІ**, Уводзіны, Ведзяннё, Вядзе́нне, Вадзе́нне, Багародзіца, народнае свята, якое звязана з хрысціянскай падзеяй увядзення дзевы Марыі ў храм; адно з праваслаўных дванадзесятых свят. Адзначаецца 4 снежня па н. ст. У гэты дзень трохгадовая дзева Марыя была ўведзена ў Святая Святых Іерусалімскага храма і тым самым узвялічана Богам у знак таго, што яна стане Маці Ісуса Хрыста. Марыя засталася жыць у храме, дзе навучылася закону Божаму і рукадзеллю. Яна шмат малілася, чытала Свяшчэннае пісанне і прасіла Бога, каб той паслаў чалавецтву Збавіцеля. Звязвалі гэтае свята і са святой *Варварай* (свят-

кавалася 17 снежня н.ст.). Тлумачылі, што свята названа «Вадзенне» таму, што калі ворагі хрысціянства мучылі святую Варвару, то вадзілі яе на повадзе і білі. Казалі таксама, што Вадзенне названа так таму, што «водзяцца ваўкі». Назву афіцыяльнага царкоўнага свята народ тлумачыў па-свойму: «Бог прыводзіць зіму на зямлю». Як зіма павядзе сябе ў гэты дзень, такая яна, у асноўным, уся будзе. Прадугледжвалася магчымае пацяпленне: «Уведзенне разбівае ледзенне». На Чарнігаўскім Палессі дзяўчаты-беларускі, кладучыся спаць напярэдадні свята, загадвалі: «Святое Увядзенне, вядзі мяне туды, ідзе мне жыць». І спадзяваліся сасніць хату будучага мужа. На Маладзечаншчыне «на Багародзіцу» варажылі, наламаўшы вішнёвых галінак і паставіўшы за абраз. Кожная была задумана на пэўнага чалавека. Перад Багатай Куццёю, напярэдадні старога Новага года, глядзелі: калі галінка расцвітала зусім — гэта быў добры знак, калі ж засыхала — наадварот. Гэтак варажылі не толькі на замужжа, але наогул на будучы лёс чалавека. «На «Ведзяннё» (як і на Тройцу і Новы год) дзяўчаты збіраліся на ігрышча і куміліся: «Ведзяннё — каб было ў дзевак піцяннё і едзяннё».

*Літ.*: Беларускі народны каляндар. Мн., 1992. С. 187–188; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 555–556.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ